# ГУЛЬНІ ТРОНАЎ

## Чым завершыцца супрацьстаянне Катара?



Катар несумненна стаў адным з галоўных сусветных ньюсмейкераў мінулага месяца. Пятага чэрвеня Саудаўская Аравія, Егіпет, Бахрэйн і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты абвясцілі аб разрыве дыпламатычных адносін з гэтай краінай. Прадстаўнікі «чацвёркі» абвінавацілі Доху ў дэстабілізацыі ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў арабскіх дзяржавах, а таксама ў падтрымцы тэрарыстычных арганізацый. Да байкоту пазней далучыліся Емен, Лівія, Мальдывы, Маўрыкій, Маўрытанія, Саюз Каморскіх Астравоў. Доха назвала абвінавачванні беспадстаўнымі. Тыдзень таму Кувейт (які выступіў у якасці пасярэдніка) перадаў Катару пералік з 13 патрабаванняў для аднаўлення адносін. У гэтым спісе — скарачэнне вяшчання тэлеканала Al Jazeera за межамі і спыненне дыпламатычных адносін з Іранам. Таксама Катар павінен неадкладна закрыць ваенную базу Турцыі і спыніць з ёй ваеннае супрацоўніцтва. Акрамя таго, эмірату неабходна выплаціць вялікую кампенсацыю. На выкананне ўсіх патрабаванняў адведзена 10 дзён. Аднак днямі кіраўнік МЗС Катара Махамед бін Абдурахман аль Тані заявіў, што Доха адхіляе ўльтыматум краін Персідскага заліва, але гатовая сесці за стол перамоў з арабскімі дзяржавамі. Прычым гэта адбылося пасля яго сустрэчы ў Вашынгтоне з дзяржсакратаром ЗША Рэксам Тылерсанам. Такім чынам, інтрыга становіцца яшчэ больш закручанай. Чым жа завершыцца «бура ў Заліве»?

### $127,7 тыс. на чалавека

Спачатку, што называецца, «сарыентуемся на мясцовасці». Дзяржава Катар размяшчаецца на Блізкім Усходзе. Яна атрымала незалежнасць ад Вялікабрытаніі ў 1971 годзе. Мяжуе з Саудаўскай Аравіяй на поўдні, з усіх астатніх бакоў абмываецца Персідскім залівам. Катар невялічкі па плошчы — усяго 11,4 тыс. кв. кіламетраў, падзелены на сем муніцыпалітэтаў. Па колькасці насельніцтва займае 139-е месца ў свеце (2,7 млн чалавек). Каля 90 працэнтаў жыхароў сканцэнтравана ў сталіцы Досе і яе прыгарадах. Больш за 4/5 насельніцтва краіны — працоўныя мігранты. У гэтай краіне адзін з самых нізкіх узроўняў беспрацоўя ў свеце (0,2% па выніках мінулага года).

Паводле звестак Міжнароднага валютнага фонду, Катар займае першае месца ў свеце па аб'ёме валавога ўнутранага прадукту ў разліку на душу насельніцтва ($127,7 тыс. па выніках мінулага года). Аснова эканомікі краіны — нафтагазавы сектар (больш за 70% даходаў бюджэту). Катар знаходзіцца на трэцім месцы ў свеце (пасля Расіі і Ірана) па доказаных запасах прыроднага газу (24,2 трлн кубаметраў) і на 12-м — па запасах нафты (25,2 млрд барэляў). Па аб'ёмах здабычы прыроднага газу Катар займае чацвёртае месца ў свеце (174 млрд кубаметраў у год), таксама ўваходзіць у дзясятку краін па аб'ёмах нафтаздабычы (1,52 млн барэляў у дзень).

Ключавымі партнёрамі па экспарце з'яўляюцца Паўднёвая Карэя (18,3%), Японія (18,2%) і Індыя (12,4%). Па імпарце — ЗША (13,7%), Францыя (10,1%) і Вялікабрытанія (9,1%). Афіцыйная мова Катара — арабская. Дзяржаўная рэлігія — іслам сунніцкага толку. Форма праўлення — абсалютная манархія. З 2013 года на чале дзяржавы стаіць эмір Тамім бен Хамад Аль Тані. У 2005 годзе быў заснаваны Qatar Investment Authority (Суверэнны фонд Катара), які ўваходзіць у дваццатку найбуйнейшых сусветных суверэнных фондаў дабрабыту (335 млрд долараў па звестках на студзень 2017 года). Акрамя фінансавых актываў, у краіны ёсць і інфармацыйныя. У 1996 годзе па ўказе эміра быў створаны тэлеканал Al Jazeera — адзін з самых уплывовых СМІ ў арабскіх краінах. Вядома, з такімі важкімі стратэгічнымі рэсурсамі невялічкі па плошчы і колькасці насельніцтва Катар апраўдана імкнуўся да таго, каб прэтэндаваць на ролю аднаго з найбольш уплывовых гульцоў блізкаўсходняга рэгіёна.

### Новы «расклад»

З некаторых часоў улады эмірата сталі весці на Блізкім Усходзе сваю гульню, не азіраючыся на Эр-Рыяд. Самыя сур'ёзныя спрэчкі паміж дзвюма манархіямі Персідскага заліва паўсталі падчас «арабскай вясны». Інтарэсы дзвюх краін не супадалі і ў многіх іншых гарачых кропках: Сірыі, Іраку, Лівіі, Емене і нават на палесцінскіх тэрыторыях.

Якія б абвінавачванні ні выпускалі афіцыйныя асобы арабскага свету, галоўная прычына разрыву з Катарам — геапалітычнае саперніцтва паміж гэтым эміратам і Саудаўскай Аравіяй, лічаць эксперты. Калі арабскія краіны Персідскага заліва абвясцілі аб разрыве дыпламатычных адносін, іх сігнал быў цалкам выразны: Катар павінен весці адзіную з усімі рэгіянальную палітыку, інакш яму давядзецца дорага заплаціць. Прайшоў амаль месяц, а эмірат, верагодна, не спяшаецца саступаць. Захаванню расколу спрыяе і непаслядоўнасць знешняй палітыкі прэзідэнта ЗША Дональда Трампа. Як заўважаюць эксперты, аб'яўленне Катара рэгіянальным парыем наўрад ці зменіць планы гэтай краіны, прычым з дзвюх прычын. Па-першае, яна проста занадта багатая, каб ёю можна было з лёгкасцю панукаць. Эканоміка Катара не моцна пацерпіць ад гандлёвага эмбарга і забароны на паездкі, якія ўвялі Саудаўская Аравія, ААЭ, Бахрэйн і Егіпет.

Другая прычына, чаму Катар можа дазволіць сабе спакойна чакаць, не рэагуючы на дзеянні суседзяў, — стратэгічная важнасць гэтай краіны для ЗША. Тут знаходзіцца найбуйнейшая база Штатаў у раёне Персідскага заліва — Эль-Удэйд (11 тыс. вайскоўцаў), а таксама размяшчаецца камандны пункт ВПС ЗША ў рэгіёне. Найбуйнейшыя суседзі Катара ў Персідскім заліве, відаць, глядзяць на гэтую сітуацыю па-іншаму, аднак амерыканскай дыпламатыі ўдавалася падтрымліваць паміж імі мір у папярэднія моманты рознагалоссяў. Але гэта была раней. Сённяшняя адміністрацыя Трампа дэманструе адсутнасць здольнасцяў змякчаць рэгіянальныя напружанасці. Пасля дыпламатычнага разрыву Трамп рэзка раскрытыкаваў Катар у Twitter, фактычна ўзяўшы на сябе частку адказнасці за рашэнне Саудаўскай Аравіі і ААЭ. Гэтая заява ўскладніла амерыканскую палітыку: Пентагон і Дзяржэпартамент былі вымушаны абраць больш нейтральны тон. Прадстаўнік Пентагона пахваліў Катар за «пастаяннае імкненне падтрымліваць бяспеку ў рэгіёне», а супрацоўнік Дзяржэпартамента назваў адносіны ЗША з гэтай краінай «трывалымі» і адзначыў яе намаганні, накіраваныя на барацьбу з фінансаваннем тэрарызму.



Катар асмялеў толькі пасля таго, як атрымаў адназначную замежную падтрымку. Ультыматум, які выпусціла Саудаўская Аравія і яе саюзнікі Досе, можна лічыць адрынутым, па меншай меры, у галоўным пункце. Эмірат не толькі адмовіўся разрываць адносіны з Іранам, але і заявіў пра гатоўнасць да супрацоўніцтва з гэтай краінай для вырашэння рэгіянальных супярэчнасцяў. Як заўважаюць эксперты, на Блізкім Усходзе на нашых вачах складаецца новая геапалітычная рэальнасць. Насуперак саудаўскай пагрозе ствараецца альянс Катара, Ірана і Турцыі. Праўда, лічаць аналітыкі, наўрад ці ён будзе доўгім і трывалым.

Прэзідэнт Ірана Хасан Раўхані падчас тэлефоннай размовы заявіў эміру Катара Таміму бен Хамаду Аль Тані пра поўную падтрымку свайго паўднёвага суседа ў канфлікце з Саудаўскай Аравіяй. Раўхані раскрытыкаваў «аблогу Катара», назваўшы яе «непрымальнай». «Калі паміж краінамі рэгіёна ёсць рознагалоссі, то ціск, запалохванне і санкцыі не з'яўляюцца спосабамі іх урэгулявання», — цытуе Al Jazeera заяву прэзідэнта ісламскай рэспублікі. Іран будзе на баку ўрада Катара, запэўніў Раўхані. «Іранская паветраная прастора, наземная і марская заўсёды будуць адкрыты для Катара», — падкрэсліў прэзідэнт Ірана.

Больш за тое, ён выказаў гатоўнасць аказаць усю неабходную дапамогу, аж да паставак харчавання, у выпадку калі ўлады эмірата звернуцца з такой просьбай. Эмір прэзідэнту за падтрымку падзякаваў, адмовіўшыся (дарэчы, ужо не першы раз) ад якой-небудзь харчовай дапамогі, бо нягледзячы на блакаду, праблем з забеспячэннем насельніцтва таварамі першай неабходнасці краіна, як ён сцвярджае, не адчувае. Ён выказаў гатоўнасць прадоўжыць супрацоўніцтва з Іранам.

Катару даводзіцца мякка абыходзіцца з Іранам, таму што гэтыя дзве краіны сумесна валодаюць найбуйнейшым у свеце радовішчам прыроднага газу — Паўднёвы Парс у Персідскім заліве. Акрамя таго, Іран прапанаваў пастаўляць 40% неабходнага Катару харчавання, якое краіна перастала атрымліваць з Саудаўскай Аравіі з-за блакады. Рызыка, што Катар будзе занадта моцна зацягнуты на іранскую арбіту, не вельмі вялікая, але любое пацяпленне сувязяў паміж гэтымі дзвюма краінамі павінна трывожыць адміністрацыю ЗША, паколькі галоўны пункт блізкаўсходняй палітыкі Трампа — ізаляцыя Ірана.

У сваю чаргу прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган заявіў: Анкара «паважае і падтрымлівае» нязгоду Катара з 13 патрабаваннямі арабскіх краін. Патрабаванне спыніць разгортванне турэцкай базы і вывесці адтуль войскі «непаважліва ў адносінах да Турцыі», заўважыў Эрдаган. Ён нагадаў, што яго краіна прапаноўвала размясціць базу не толькі ў Катары, але і ў Саудаўскай Аравіі, але гэтая прапанова так і не атрымала адказу ад Эр-Рыяда. «Само рашэнне Эрдагана стварыць базу ў Катары было агучана яшчэ ў 2013 годзе, аднак тады арабскія краіны так не абураліся», — адзначыў начальнік аддзела даследаванняў блізкаўсходніх канфліктаў і ўзброеных сіл рэгіёна расійскага Інстытута інавацыйнага развіцця Антон Мардасаў. Але цяпер турэцкія вайскоўцы ў Катары (меркаваны кантынгент — ад 3 да 5 тысяч) разглядаюцца арабамі ў якасці вялікай падтрымкі Дохі, у тым ліку на выпадак магчымых пераваротаў.

### Альянсы і кааліцыі

Відавочна, што бакі супрацьстаяння здабываюць сваю выгаду. Абодва прэтэндэнты на ролю рэгіянальных лідараў — Турцыя і Іран — пазначылі падтрымку мяцежнага эмірата. «У Катара склаліся канструктыўныя адносіны з Іранам, у адрозненне ад Саудаўскай Аравіі, для якой гэта непрымальна, і ён выступае за іх захаванне, — адзначыў Антон Мардасаў. — Аднак супрацоўніцтва з ІРІ, а таксама з Турцыяй носіць характар выключна двухбаковых адносін. Катар і раней вёў такую «дэстабілізацыйную палітыку». Але Доха наўрад ці будзе відавочна супрацьпастаўляць сябе кааліцыі, якая фармуецца супраць Ірана. Відавочна сабатаваць, уступаючы ў нейкую процілеглую кааліцыю, не ў яго інтарэсах. Доха будзе займаць больш нейтральную пазіцыю. Нягледзячы на цяперашні байкот Катара, нават у Саудаўскай Аравіі па шэрагу кірункаў працягваецца з ім супрацоўніцтва. Але і Іран выйграе ад сітуацыі праз інтэнсіфікацыю «кантактаў, ад якіх, магчыма, раней устрымліваўся». У цэлым «паказальная лупцоўка» Катара кардынальна не змяняе баланс сіл у рэгіёне».

Спіс краін, якія разарвалі дыпламатычныя адносіны, уражвае. Аднак не менш важна і тое, якія дзяржавы ў гэтую кааліцыю не ўвайшлі. У ёй няма Кувейта і Амана, хоць абедзве краіны з'яўляюцца членамі Савета супрацоўніцтва арабскіх дзяржаў Персідскага заліва (у яго таксама ўваходзяць Катар, Бахрэйн, Саудаўская Аравія і ААЭ). Антыкатарскі блок не змог пераканаць нават самых блізкіх саюзнікаў рушыць услед свайму прыкладу. Іарданія абвясціла, што панізіць узровень дыпламатычных адносін, не даўшы пры гэтым ніякіх падрабязнасцяў. Калі Катар зможа падтрымліваць адносіны з Іарданіяй і Кувейтам, эфект цяперашняй кампаніі акажацца, хутчэй за ўсё, абмежаваным. Прынамсі ўсе папярэднія спробы ізаляваць арабскія краіны, прычым значна больш уразлівыя, у канчатковым выніку праваліліся. Калі Іран захапіў частку тэрыторыі Ірака ў 1986 годзе, той жа самы альянс, які сёння выкрывае Катар, запатрабаваў ад Сірыі абмежаваць сувязі з Іранам. Саудаўская Аравія выкарыстала метад бізуна і перніка — напрыклад, прапаноўвала замяніць Іран у ролі галоўнага пастаўшчыка нафты ў Сірыю. Але нягледзячы на тое, што гэтая краіна адчувала сур'ёзныя цяжкасці з-за вялікага дэфіцыту плацёжнага балансу, некалькіх гадоў засухі і скарачэння знешняй дапамогі, яна аспрэчыла патрабаванні саудаўскай кааліцыі.

Зрэшты, вакуум лідарства, створаны амерыканцамі, адкрыў магчымасці для рэгіянальнай дыпламатыі: у цяперашнім крызісе пасярэднікам спрабуе выступіць Кувейт. Не выключана, што бакі дамовяцца адысці ад краю прорвы ў абмен на касметычныя саступкі. Але, лічаць эксперты, нашмат верагодней захаванне напружанасці на працягу яшчэ многіх месяцаў, калі не гадоў. Ужо і так фрагментаваны Блізкі Усход працягне расколвацца.

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*

■ На слыху

# БЕЛАРУСКІ ЗАВОД У АНГОЛЕ. ХУТКА

## Дапаможам пазбавіцца ад татальнага імпарту і зблізімся з Панафрыканскім парламентам?

**Падзенне кошту нафты на сусветным рынку ціснe на мноства эканомік. Асаблівым чынам гэты фактар датычыцца тых краін, у ВУП якіх долі ад рэалізацыі нафты і нафтавых прадуктаў займаюць занадта шмат месца. Такая сітуацыя сёння і ў Анголы, дзяржавы, якая літаральна жыве на чорным золаце і алмазах.**

Як адзначыў **кіраўнік знешнепалітычнага ведамства гэтай краіны Жоржэ Рэбелу Пінту ШЫКОЦІ** падчас перагавораў са **старшынёй Палаты прадстаўнікоў Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ,** пасля ўскладнення эканамічнай сітуацыі на фоне падзення коштаў на нафту Ангола ўзяла курс на дыверсіфікацыю эканомікі, у тым ліку развіццё сельскагаспадарчага сектара. «Мы апынуліся ў сітуацыі, калі фактычна ўсе прадукты харчавання, усё наша абсталяванне, а таксама некаторыя віды паслуг імпартуюцца ў краіну і мы па сутнасці нічога не выраблям», — растлумачыў сітуацыю прадстаўнік Анголы.

Аднак не толькі падзенне коштаў на энерганосьбіты, але і глабалізацыя сёння з'яўляюцца неад'емнымі ўмовамі палітыка-эканамічнай гульні на сусветнай арэне. Дзякуючы другой прадстаўнікі Афрыканскага кантынента змаглі знайсці сабе падтрымку на іншым канцы свету — у нашай краіне. Былыя партнёры часоў СССР разышліся яшчэ ў 90-х і да 2012 года двухбаковыя кантакты насілі толькі эпізадычны характар. «Аднак прыемна адзначыць, што сёння нашы краіны ўбачылі існуючыя магчымасці, якія безумоўна дапамогуць палепшыць узаемадзеянне ў будучыні, — адзначыў Жоржэ Рэбелу Пінту Шыкоці. — Патэнцыял Беларусі вельмі падыходзіць для выканання задачы па дыверсіфікацыі». Ён расказаў, што ў рамках гэтага візіту дэлегацыя здолела ацаніць магчымасці беларускага машынабудавання і сельскай гаспадаркі, а таксама абсталявання для горназдабыўной прамысловасці. Таксама бакі ўжо сышліся ў меркаванні аб неабходнасці пачаць супрацоўніцтва ў фінансавым сектары. «Банкі павінны падтрымліваць экспартныя пастаўкі беларускага абсталявання ў Анголу, а таксама рэалізацыю сумесных праектаў. Адным з такіх праектаў павінен стаць зборачны цэх беларускіх трактароў у Анголе, на базе якога мы б у наступным змаглі стварыць зборачную вытворчасць аўтамабільнай тэхнікі. Толькі гэта створыць дадатковыя ўмовы для развіцця сельскай гаспадаркі ў Анголе і вытворчасці і перапрацоўкі прадуктаў харчавання. Гэта дасць магчымасць нам адысці ад татальнага імпарту», — падкрэсліў міністр знешніх зносін Рэспублікі Анголы.

«Анголу мы лічым адным з ключавых нашых партнёраў на Афрыканскім кантыненце. У нас няма ніякіх праблем у плане пашырэння супрацоўніцтва па ўсіх напрамках, якія з'яўляюцца ўзаемна цікавымі», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка. Паводле яго слоў, важнае значэнне ў выбудоўванні міждзяржаўнага дыялогу належыць парламентам. Спікер звярнуў увагу, што ў Нацыянальным сходзе створана рабочая група па супрацоўніцтве з парламентам Анголы. «Ведаю, што ў жніўні сёлета адбудуцца выбары ў Нацыянальную асамблею вашай краіны, і мы будзем рады, калі будзе створана аналагічная група дружбы па супрацоўніцтве з Беларуссю», — сказаў ён.

Уладзімір Андрэйчанка прапанаваў супрацоўнічаць у афрыканскім рэгіёне і ў міжпарламенцкіх арганізацыях, у першую чаргу — з Панафрыканскім парламентам. «Мы зацікаўлены пры садзейнічанні Анголы працаваць з гэтай паважанай міжнароднай парламенцкай арганізацыяй», — запэўніў Уладзімір Андрэйчанка.

**Ільля КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*


ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «ВЯЛІКІ КУШ»

А-100

Настоящие Правила разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 №51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Вялікі куш» (далее – Игра), проводимой в целях стимулирования реализации топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ) среди участников программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг», владеющих брелоком (накопительные информационно-учетные карты с индивидуальным номером, в дальнейшем – Брелок), в г. Минске, Минской области, Брестской области.

**1. Организатор Игры.**
Организатором Игры является Общество с дополнительной ответственностью «Астотрейдинг» (ОДО «Астотрейдинг»), находящееся по адресу 223053, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Боровая, дом 7, административные помещения; УНП 690362737; e-mail: a-100@a-100.by

**2. Наименование игры.**
Игра носит название «Вялікі куш».

**3. Участники Игры.**
В Игре могут принять участие дееспособные физические лица, проживающие на территории Республики Беларусь в период проведения Игры, граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь и имеющие вид на жительство в Республике Беларусь, владеющие Брелоком.
Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**4. Права участников Игры**.
Участник Игры имеет право: знакомиться с Правилами Игры, принимать участие в Игре на условиях, определенных Правилами, и получать соответствующие Призы.

**5. Сроки проведения Игры**
Начало Игры: 4 июля 2017 года
Окончание Игры: 28 августа 2017 года.

**6. Территория проведения Игры:**
Республика Беларусь, а именно: территория, на которой расположены автозаправочные станции ОДО «Астотрейдинг» (далее – АЗС ОДО «Астотрейдинг»), г. Минск, Минская область, Брестская область.

**7. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования которых проводится Игра**
Игра проводится в целях стимулирования реализации топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ), сопутствующих товаров и услуг среди участников программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг», владеющих Брелоком.

**8. Призовой фонд**

| Наименование | Количество, призов | Общая стоимость с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| Денежные средства на приобретение топлива в размере 1 122 (одна тысяча сто двадцать два) белорусских рубля 33 (тридцать три) копейки в сети АЗС ОДО «Астотрейдинг» и денежные средства в размере 177 (сто семьдесят семь) рублей 67 (шестьдесят семь) копеек для уплаты подоходного налога | 1 | 1300 |
| Денежные средства на приобретение топлива в размере 64 (шестьдесят четыре) белорусских рубля 50 (пятьдесят) копеек в сети АЗС ОДО «Астотрейдинг» | 50 | 3225 |

Призовой фонд игры в размере **4 525** (четыре тысячи пятьсот двадцать пять) белорусских рублей формируется за счет денежных средств Организатора.

**9. Порядок участия в Игре.**
9.1. Для участия в Игре в период с 00:00:01 4 июля 2017 года по 23:59:59 21 августа 2017 года необходимо выполнить следующие условия:
• **1-й этап:** 00:00:01 4 июля 2017 года по 23:59:59 17 июля 2017 года – заправиться любым видом топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ) на сумму 15 (пятнадцать) белорусских рублей и более на любой АЗС согласно приведенной таблице.
• **2-й этап:** 00:00:01 18 июля 2017 года по 23:59:59 24 июля 2017 года – приобрести большой кофейный напиток (американо, капучино, латте) или чай (зеленый, черный фруктовый) на любой АЗС согласно приведенной таблице.
• **3-й этап:** 00:00:01 25 июля 2017 года по 23:59:59 31 июля 2017 года – приобрести фирменный гамбургер на любой АЗС согласно приведенной таблице.
• **4-й этап:** 00:00:01 1 августа 2017 года по 23:59:59 7 августа 2017 года – приобрести товары для автомобиля на сумму 5 белорусских рублей и более на выбор на любой АЗС согласно приведенной таблице.
Перечень товаров, участвующих в игре:
- Средство Eclips для чистки стекол 0,5 л;
- Губка Quick Eclips для авто 2в1;
- Коврик противоскользящий 20 х 20 см сетка (черный);
- Салфетка синтетическая «Ультра замша» 43*32;
- Ароматизатор для авто LITTLE TREES ваниль;
- Ароматизатор для авто LITTLE TREES новое авто;
- Ароматизатор для авто LITTLE TREES черный лед;
- Салфетка из микрофибры «New shine» универсальная 35*40 см;
- Ароматизатор для авто LITTLE TREES пина колада;
- Губка Double Eclips для мытья автомобиля 2в1;
- Салфетка синтетическая «Ультра замша» влажная в тубусе 43*32 см.
• **5-й этап:** 00:00:01 8 августа 2017 года по 23:59:59 14 августа 2017 года – приобрести товары на сумму 5 белорусских рублей и более на детской полке (обозначенные акционным стикером), на здоровой полке (акционным стикером), спортивной полке (обозначенные акционным стикером), на любой АЗС согласно приведенной таблице.
Перечень товаров, участвующих в игре:
**Детская полка:**
- Kinder Surprise 20г;
- Нектар ANGRY BIRDS грушево-яблочный 0,2 л;
- Нектар ANGRY BIRDS смесь фруктовая 0,2 л;
- Нектар ANGRY BIRDS смесь ягодная 0,2 л;
- Нектар ANGRY BIRDS персик 0,2 л;
- Мармелад «HARIBO» жевательный 70 г;
- Мармелад «HARIBO» жевательный 140 г;
- Игрушка Мыльные пузыри «Миньоны» 50 мл;
- Игрушка Мыльные пузыри «Щенячий патруль» 50 мл;
- Вода «Святой источник» негазированная 0,33 л.
**Здоровая полка:**
- Батончик-мюсли «GRANOLA» с яблоком и клюквой;
- Батончик-мюсли «GRANOLA» со сливой и шоколадом;
- Батончик-мюсли «GRANOLA» с орехами и медом;
- Батончик-мюсли «GRANOLA» со сливой и шоколадом;
- Батончик-мюсли «GRANOLA» с орехами и миндалем;
- Батончик-мюсли «GRANOLA» с яблоком и клюквой;
- Напиток ФИТОГУРУ INTELLECT гранат / черноплодная рябина / мелисса 0,28 л;
- Напиток ФИТОГУРУ TONUS грейпфрут/апельсин 0,28 л;
- Напиток ФИТОГУРУ VISION черника/смородина 0,28 л;
- Напиток ФИТОГУРУ MAN'S FORCE тыква/морковка/имбирь 0,28 л;
- Флаксы с бананом, «КЗ» 150 гр;
- Флаксы с яблоком и корицей, «КЗ» 150 гр;
- Флаксы с чесноком, Компас Здоровья, 150 гр;
- Напиток Зедазени груша 0,5 л;
- Напиток Зедазени лимон 0,5 л;
- Напиток Зедазени крем-сливки 0,5 л;
- Напиток Зедазени Саперави 0,5 л;
- Напиток Зедазени Тархун 0,5 л.
**Спортивная полка**
- Батончик протеин RECORD BAR чиз 60 г;
- Батончик протеин RECORD BAR брауни 60 г;
- Батончик протеин RECORD BAR тир 60 г.
• **6-й этап:** 00:00:01 15 августа 2017 года по 23:59:59 21 августа 2017 года – приобрести сопутствующие услуги (мойка портальная, мойка туннельная, мойка самообслуживания, мойка бесконтактная, аренда прицепа, пылесос) на сумму 5 белорусских рублей и более на любой АЗС согласно приведенной таблице.

| Номер АЗС | Адрес |
|---|---|
| АЗС №1 | г. Минск, ул. Пригородная, 69 |
| АЗС №2 | Минский р-н, д. Боровая, 7 |
| АЗС №5 | г. Минск, ул. Масюковщина, 2а, корп. 3 |
| АЗС №6 | г. Минск, ул. Харьковская, 81 |
| АЗС №7 | г. Минск, пр-т Партизанский, 8а |
| АЗС №11 | г. Минск, ул. Машиностроителей, 7Б |
| АЗС №12 | г. Минск, ул. Притыцкого, 62В |
| АЗС №13 | г. Минск, ул. Радиальная, 13А |
| АЗС №15 | г. Минск, ул. Промышленная, 2Б (МКАД) |
| АЗС №16 | г. Минск, ул. Казинца, 133 (МКАД) |
| АЗС №17 | г. Минск, ул. Некрасова, 41 |
| АЗС №18 | Минский район, Новодворский с/с, М4, 15км, 2 (д. Ельница) |
| АЗС №19 | г. Минск, ул. Брикета, 23 (МКАД) |
| АЗС №20 | г. Минск, Долгиновский тракт, 190 (МКАД) |
| АЗС №21 | г. Минск, ул. Ваупшасова, 40, |
| АЗС №22 | Минская обл., Смолевичский р-н,<br>автодорога Минск – Брест – граница РФ, км 388 (право) |
| АЗС №23 | г. Минск, Казимировская, 39 |
| АЗС №24 | Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Р 1 |
| АЗС №25 | Минский р-н, аг. Сеница, ул. Зеленая,1/4 |
| АЗС №26 | г. Брест ул. 28 июля |
| АЗС №27 | г. Брест ул. Радужная, 20 |
| АЗС №28 | г. Брест, пр-т Республики, 6 |
| АЗС №29 | г. Брест, ул. Я. Купалы, 106/4 |
| АЗС №30 | г. Минск, ул. Аннаева, 47 |
| АЗС №31 | г. Минск, ул. Академическая, 34 |
| АЗС №32 | Брестская область, Малоритский р-н, агр. Мокраны, ул. Брестская |
| АЗС №35 | Минский р-н, Новодворский с/с, 82 |

9.2. В Игре принимают участие только владельцы зарегистрированных Брелоков. Зарегистрировать Брелок необходимо через личный кабинет, ссылка на который расположена на главной странице официального сайта Организатора по адресу https://azs.a-100.by . Для регистрации необходимо:
- заполнить все обязательные поля в анкете (помеченные символом * (звездочка), а именно: фамилия, имя, отчество, пол, дата рождения, адрес электронной почты, номер мобильного телефона, адрес проживания, вид топлива;
- получить на указанный пользователем в анкете номер телефона код активации, ввести его в личном кабинете;
- завершить регистрацию, нажав на соответствующую кнопку.
9.3. В Игре принимают участие участники, выполнившие требования настоящих Правил.

**10. График проведения розыгрышей призового фонда**
Розыгрыши призового фонда Игры проходят:
- еженедельно по вторникам разыгрываются 10 призов – денежные средства на приобретение топлива в размере 64 (шестьдесят четыре) белорусских рубля 50 (пятьдесят) копеек в сети АЗС ОДО «Астотрейдинг»: 18.07.2017, 25.07.2017, 01.08.2017, 08.08.2017, 15.08.2017 в 11:00 в офисе ОДО «Астотрейдинг», расположенном по адресу: г. Минск, Минский р-н, д. Боровая, 7
- 22.08.2017 разыгрывается 1 приз – денежные средства на приобретение топлива в размере 1122 (одна тысяча сто двадцать два) белорусских рубля 33 (тридцать три) копейки в сети АЗС ОДО «Астотрейдинг» и денежные средства в размере 177 (сто семьдесят семь) рублей 67 (шестьдесят семь) копеек для уплаты подоходного налога, в 11:00 в офисе ОДО «Астотрейдинг», расположенном по адресу: г. Минск, Минский р-н, д. Боровая, 7

**11. Механика розыгрыша призового фонда Игры. Определение победителя Игры. Информирование победителей.**
11.1. В дни розыгрышей в 9.00 формируется список тех участников Рекламной игры, которые выполнили все условия Игры за период, а именно:
18.07.2017 за период с 04.07.2017 по 17.07.2017;
25.07.2017за период с 18.07.2017 по 24.07.2017;
01.08.2017 за период с 25.07.2017 по 31.07.2017;
08.08.2017 за период с 01.08.2017 по 07.08.2017;
15.08.2017 за период с 08.08.2017 по 14.08.2017.
22.08.2017 за период с 04.07.2017 по 21.08.2017;
11.2. Все участники, выполнившие условия этапов 1-5, автоматически становятся участниками розыгрыша за соответствующий период. В финальном розыгрыше участвуют все участники, выполнившие условия 6 этапов Рекламной игры.
11.3. Еженедельно Победителями становятся 10 участников игры. Номера брелоков программы «Дзякуй» всех участников, выполнивших условия Рекламной игры в определенный период, распечатываются на карточках, которые помещаются в лототрон. Член Комиссии раскручивает лототрон и в случайном порядке извлекает из него 10 карточек с номерами карт-брелоков программы «Дзякуй», определяя таким образом победителей еженедельного розыгрыша.
Финальный розыгрыш предусматривает розыгрыш одного приза. Номера брелоков программы «Дзякуй» всех участников, выполнивших условия всех этапов Рекламной игры, распечатываются на карточках, которые помещаются в лототрон. Член Комиссии раскручивает лототрон и в случайном порядке извлекает из него 1 карточку с номером карты-брелока программы «Дзякуй», определяя таким образом победителя розыгрыша.
11.4. Итоги розыгрыша призового фонда Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии. К Протоколу комиссии.
11.5. Участники Игры вправе еженедельно ознакомиться с результатами розыгрыша на официальном сайте компании http://azs.a-100.by/company/news. Результаты розыгрыша будут опубликованы на сайте в день розыгрыша в 16.00.
11.6. Информирование победителя производится по электронной почте путем письменного уведомления о выигрыше и СМС-сообщения на указанный в личном кабинете номер телефона в день розыгрыша. Дополнительное информирование победителя осуществляется путем сообщения в личном кабинете участника программы благодарности «Дзякуй» по результатам проведения розыгрыша.

**12. Порядок выдачи призов**
Выдача приза осуществляется в день розыгрыша после его проведения путем зачисления на счет в личном кабинете эквивалента денежных средств в размере 64 белорусских рублей 50 копеек на приобретение топлива в сети «А-100» или эквивалента денежных средств на приобретение топлива в размере 1122 (одна тысяча сто двадцать два) белорусских рубля 33 (тридцать три) копейки в сети АЗС ОДО «Астотрейдинг» и денежные средства в размере 177 (сто семьдесят семь) рублей 67 (шестьдесят семь) копеек для уплаты подоходного налога.
Зачисление эквивалента денежных средств производится в зависимости от выбранного в личном кабинете участником топлива в графе «Вид топлива» при регистрации Брелока.
Приз, зачисленный на счет в личном кабинете, необходимо использовать на АЗС ОДО «Астотрейдинг» по целевому назначению по 31.12.2017 (включительно).
Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускается.
При выдаче каждого приза Организатор в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, исчисляет и удерживает из стоимости приза за счет соответствующих денежных вознаграждений, входящих в его состав, и перечисляет в бюджет подоходный налог на сумму такого приза в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Факт участия в Игре подразумевает, что ее Участники соглашаются с настоящими Правилами, в том числе условиями выдачи приза, а также с тем, что в рамках Игры их фамилии, имена, отчества, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения.
Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.
В случае отказа победителя от получения приза, неполучения приза в установленные правилами порядке и сроки либо невыполнения условий его получения приз остается у Организатора и используется по своему усмотрению.

**13. Состав Комиссии по проведению Игры.**
Для проведения Игры, контроля за соблюдением Правил Игры, утверждения результатов, подведения итогов по результатам проведения розыгрыша Организатором создается комиссия по ее проведению в следующем составе:
Председатель Комиссии – начальник отдела маркетинга ОДО «Астотрейдинг» Ермак Елена Александровна.
Члены Комиссии:
- специалист по работе с клиентами ОДО «Астотрейдинг» Казеко Анастасия Алексеевна;
- главный бухгалтер ЧП «Биминок» Субоч Татьяна Евгеньевна;
- заместитель директора по правовым вопросам ОДО «Астогарант» Лабазинский Дмитрий Болеславович;
- начальник службы оперативной аналитики ОДО «Астотрейдинг» Лапицкий Юрий Александрович.

**14. Информация об Игре, публикация Правил Игры.**
Правила Игры будут опубликованы в газете «Звязда» до начала рекламной игры.
Результаты Игры будут опубликованы в газете «Звязда» не позднее 28.08.2017 г.
Дополнительно информацию об Игре можно получить на сайте Организатора: http://azs.a-100.by/company/news
Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить по телефону +375 17 233-33-33 (понедельник – четверг, с 8.30 до 17.30, пятница – с 8.30 до 17.00) или на сайте Организатора.

**15. Прочие условия**
Споры между Организатором Рекламной Игры и Участниками Рекламной Игры рассматриваются согласно действующему законодательству Республики Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №3042 от 23 июня 2017 года выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.